***Д.А. Алексеюк***
БГУ (Минск)

# ДЗЯРЖАЎНА-ПАЛІТЫЧНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЮРЫЯ ІВАНАВІЧА ІЛЛІНІЧА (1471-1526)

Апошня трэць XV ст. – пачатак XVI ст. у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ) адзначаецца фарміраваннем саслоўна-прадстаўнічага дзяржаўнага ладу, пашырэннем сацыяльных і палітычных прывілеяў пануючых станаў, значным ускладненнем знешнепалітычных адносін. З сярэдзіны XV ст. пачынае афармляцца буйное землеўладанне, на аснове якога фарміруецца магнатэрыя. Вынікам гэтых працэсаў з'яўляецца павышэнне ролі асобных радоў у палітычным жыцці ВКЛ. Аднім з такіх радоў з'яўляецца магнацкі род Іллінічаў, прадстаўнікі якога заставілі значны след ў дзяржаўна-палітычнам жыцці ВКЛ другой паловы XV – пачатку XVI ст.

Найбольшай моцы магнацкі род Іллінічаў дасягнуў ў часы Юрыя Іванавіча Ілініча. Ён дабіўся найбольшых поспехаў на дзяржаўнай службе, ў некалькі разоў павялічыў маёмасць рода, веў актыўнае грамадскае жыццё, фундатарскую дзейнасць. Менавіта з ім атаесамляецца ўвесь род Іллінічаў: яго постаць часцей за ўсіх сустракаецца ў крыніцах і літаратуры.

Пан Юрый Іванавіч Ілініч меў працяглую і ўдалую кар'еру. Праведзены намі аналіз асобных кніг Метрыкі ВКЛ па вывучаемым перыядзе дазваляе зрабіць вынікі аб дзяржаўна-палітычнай дзейнасці Юрыя Ілініча, а таксама ўдакладніць якія пасады, калі і дзе ён займаў: са снежня 1500 г. па канец 1504 г. і з лістапада 1506 г. да лета 1519 г. з'яўляўся маршалкам гаспадарскім; з ліпеня 1519 г. да смерці з'яўляўся маршалкам надворным; з сакавіка 1500 г. па канец 1504 г. і са снежня 1507 г. да смерці з'яўляўся намеснікам ці старостам лідскім; з мая 1510 г. да смерці – берасцескім; з верасня 1519 г. да лета 1523 г., з лістапада 1523 па люты 1525 г. – ковеньскім; у 1522 г. – пінскім і рагачоўскім.

Пачынаючы з маршалка гаспадарскага Юрый Іванавіч Ілініч зрабіў удалую кар'еру. Пік яго яго урадніцкай дзейнасці прыйшоўся на 1522 г., калі

адначасова Юрый Іванавіч займаў пяць пасад: маршалка надворнага, старосты берасцейскага, лідскага, ковеньскага, пінскага, рагачоўскага.

Дзейнасць Юрыя Іванавіча Ілініча на старасцінскіх пасадах заслугоўвае прызнання. Гэта быў ураднік, які абапіраўся ў сваёй адміністрацыйнай дзейнасці на закон і парадак, імкнуўся да стварэння ўмоў для эканамічнага росквіту падуладных яму зямель. Як староста берасцейскі і лідскі ён выконваў шэраг функцый, а менавіта трымаў у баявым парадку Лідскі і Берасцейскі замкі, апекаваў зясяленнем падначаленай яму тэрыторыі Лідскага і Берасцескага староставаў. Як гаспадарскі намеснік Юрый кантраляваў таксама дзейнасць корчмаў. Яшчэ адной важнай функцыяй старосты было спагнанне запазычанасцей, акрамя таго як гаспадарскі староста і маршалак Юрый Іванавіч Ілініч часта выконваў судовыя функцыі. Асаблівае стаўленне Гаспадара да Юрыя праяўлялася ў тым, што ён даручаў Юрыю разам з Албрэхтам Гаштольдам і Янам Янавічам Забярэзінскім учыніць справядліваць наконт асаблівых, вельмі спрэчных спраў.

Па абсягу і маштабах дзейнасці можна сцвярджаць, што Юрый Іванавіч Ілініч займаў даволі значнае месца ў дзяржаўнай іерархіі ВКЛ. Удалая дзяржаўна-палітычная служба дазволіла пашырыць уплыў Юрыя Іванавіча Ілініча сярод палітычнай эліты ВКЛ, а менавіта вылучыцца з кола астатніх паноў-радных. Па ступені даверу да яго з боку вялікага князя Жыгімонта Старога, а таксама па памерах ўзнагарод за службу Юрый Ілінічы быў адным з нямногіх фаварытаў манарха сярод магнатаў ВКЛ першай чвэрці XVI ст.

Высокія ўрады, якія занімаў Юрый Іванавіч прыносілі патрэбны для новых купляў прыбытак, сімпатыі вялікага князя літоўскага суправаджаліся рэгулярнымі зямельнымі наданнямі, а набліжанасць да гаспадарскага двара рабіла яго прывабным апекуном, што спрыяла хуткаму развіццю рода Ілінічаў.